# ПРЭЗІДЭНТ ПРАВЁЎ РАБОЧУЮ НАРАДУ СА СТАРШЫНЁЙ САВЕТА МІНІСТРАЎ

**Як паведаміла карэспандэнту БЕЛТА прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, 3 красавіка Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую нараду са Старшынёй Савета Міністраў Сяргеем Лінгам і яго намеснікамі.**

На нарадзе міністр прамысловасці А. Харлап праінфармаваў аб інвестыцыйных праектах у аўтамабільнай галіне рэспублікі. У прыватнасці, разглядаліся сумесныя праекты з замежнымі кампаніямі, звязаныя з мадэрнізацыяй Мінскага аўтамабільнага завода. Прэзідэнт станоўча ацаніў праведзеную работу і падтрымаў мэтазгоднасць павелічэння замежных інвестыцый у развіццё МАЗа. Разам з тым Аляксандр Лукашэнка асабліва падкрэсліў, што пры гэтым неабходна захаванне інтарэсаў не толькі працоўнага калектыву, але і дзяржавы.

Першы намеснік Старшыні Савета Міністраў П. Пракаповіч далажыў аб гандлёвым балансе краіны. Была падкрэслена неабходнасць удасканалення мытнай статыстыкі, структуры гандлёвага балансу, а таксама вызначаны шэраг мераў па павелічэнню экспарту беларускіх тавараў.

**БЕЛТА.**